УДК 882-3

З.Гімпілевіч*

Інтэлігент у «Майстры і Маргарыце» М.Булгакава

У сваёй кнізе пра М.Булгакава Лэслі Мілн сцвярджае, што раман «Майстар і Маргарыта» быў з самага першага дня задуманы як раман пра інтэлігенцыю [1]. У другой (пасля Коліна Райта) крытычнай бібліяграфіі М.Булгакава, выдадзенай на Захадзе, Элендыя Профер некалькі разоў заўважае, таксама не спыняючыся надоўга на гэтай ідэі, амаль генетычную сувязь М.Булгакава з рускай інтэлігенцыяй [2]. Э.Профер адна з першых упамінае дакумент (ліст М.Булгакава савецкаму ўраду), які лічыўся апокрыфам да параўнальна нядаўняга часу [3]. У ім аўтар, абапіраючыся, праўда, не на «Майстра і Маргарыту», а на больш раннія творы з крышталнай яснасцю выказаў свае адносіны да інтэлігенцыі: «І, урэшце, апошнія мае рысы ў загубленых п'есах – «Дні Турбіных» і «Бег» і ў рамане «Белая гвардыя»: настойлівае стварэнне вобраза інтэлігенцыі – найлепшага слою ў нашай краіне. У прыватнасці, стварэнне вобраза інтэлігенцка-дваранскай сям'і, што волею няўхільнага лёсу кінута ў гады грамадзянскай вайны ў рады белай гвардыі, у традыцыях «Вайны і міру». Такое апісанне цалкам натуральнае для пісьменніка,кроўна звязанага з інтэлігенцыяй» [4].

У «Майстры і Маргарыце» сустракаем толькі адно ўпамінанне пра інтэлігенцыю. І гэта нягледзячы на ўяўную безапеляцыйнасць крытыкаў пра ўсебаковую сувязь пісьменніка з рускай інтэлігенцыяй і ў той жа час цэлы рад фактычнага матэрыялу, дзе сцвярджаецца непрыманне Булгакавым шмат якіх прынцыповых пазіцый інтэлігенцыі свайго часу.

І гэты, і іншы пункт погляду сучаснага літаратуразнаўства найбольш поўна адлюстраваны ў крытычнай біяграфіі М.Булгакава, напісанай М.А.Чудаковай [5]. Гэта згадванне ўложана ў вусны паэта Івана Бяздомнага – чалавека, які, на першы погляд, ніякіх адносін да інтэлігенцыі не мае. Такім чынам, прастадушны, або, як пазней зазначае майстар, «нявінны» ў галіне ведаў паэт Іван Бяздомны выражае агульнапрынятае клішэ свайго пакалення: «Ён разумны, – падумаў Іван, – трэба прызнацца, што сярод інтэлігентаў таксама трапляюць на рэдкасць разумныя. Гэтага адмаўляць нельга !» [6]. У гэтай «гаворачай" фразе, да якой мы звернемся не адзін раз з-за яе выключнасці, чытач атрымлівае больш інфармацыі аб становішчы рускай інтэлігенцыі ў той час, чым у любым акадэмічным дапаможніку. Што ж па сутнасці азначаюць тэрміны «інтэлігент», «інтэлігенцыя», і ў чым роля гэтай з'явы ў «Майстры і Маргарыце» – асноўная праблема гэтай працы.

У павярхоўных, эмацыянальных і як бы сенсуальных, а не ў фізічных адносінах кожны чалавек, які размаўляе на рускай мове, заўсёды чымсьці

---

* Аўтар – прафесар аддзялення германскага і славянскіх моваў і літаратур універсітэта Ватэрлоо (Антарыо,Канада).

асацыюе гэта паняцце. Абвінаваціць яго ў недакладнасці або, горш за тое, у недасведчанасці, больш чым несправядліва, таму што нешматлікія крыніцы, да якіх ён можа звярнуцца, уражваюць знаёмай гэтаму чалавеку зыбкасцю і неаформленасцю. У слоўніку С.І. Ожэгава, напрыклад, шматслоўна згадваецца толькі прыналежнасць інтэлігента да інтэлігенцыі і затым само паняцце даволі камічна драбніцца на сацыяльна-палітычныя падгрупы: перадавая руская інтэлігенцыя, савецкая народная інтэлігенцыя, сельская інтэлігенцыя, буржуазная інтэлігенцыя і г.д. [7].

Заходняму чытачу пашанцавала трохі больш. У адным з Оксфардскіх слоўнікаў ён можа знайсці іх значэнне, якое амаль адпавядае першаснаму запыту [8]. У ім гаворыцца пра тое, што інтэлігенцыя складае адукаваную частку насельніцтва і адрозніваецца здольнасцю фарміраваць грамадскую думку. Поўны «Новы слоўнік 20-га ст.», аднак, даволі блізка паўтарае азначэнне Ул.І. Даля, у якім практычна атаясамліваюцца паняцці «інтэлігент» і «інтэлектуал» [9]. І. Берлін, які спрабаваў разгадаць гэтую рускую з'яву, лічыць атаясамліванне «інтэлігента» і «інтэлектуала» абсалютна беспадстаўным, звяртаючы ўвагу на тое, што інтэлігенцыя аб'ядноўваецца не простай еднасцю ідэй. Пагаджаючыся, відаць, з Аненкавым, які яшчэ больш за 120 гадоў назад азначаў інтэлігенцыю як асаблівы і незалежны, але падобны на манаскі ордэн, І Берлін мяркуе, што нібыта неіснуючым звычаем гэтага ордэна было ўносіць у жыццё сваё ўласнае евангелле [10]. Зразумела, што толькі «выбраным» членам грамадства – інтэлігенцыі – было дадзена гэта нябачнае евангелле.

Барыс Хазанаў, страціўшы надзею знайсці акадэмічнае або проста здавальняючае азначэнне інтэлігенцыі, прапанаваў сваё, якое не ўступае іншым ні па ступені цікавасці, ні па якасці інтрыгуючай загадкі: «Пагартаўшы слоўнікі, пераконваемся, што ў азначэннях, якія прэтэндуюць на навуковасць, знікла нешта вельмі важнае. Гэта нешта, магчыма, і складае душу інтэлігенцыі. Бо інтэлігенцыя, гэта дзіўнае параджэнне рускага жыцця, не можа быць апісана ні як чыста сацыяльны, ні як чыста культурны, ні як цалкам псіхалагічны феномен. Інтэлігенцыя – гэта лёс» [11].

У свой час, займаючыся пытаннямі лёсу інтэлігента ў паслярэвалюцыйным рускамоўным асяроддзі на прыкладзе раманаў М.Булгакава «Майстар і Маргарыта» і Б. Пастэрнака «Доктар Жывага», я зведала тую ж гаму незадаволенасці, якая існуе ў сучасным «інтэлігентазнаўстве», што і іншыя даследчыкі праблемы [12]. У выніку, грунтуючыся на думках П.Чаадаева, А.Хамякова, М.Бакуніна, І. Берліна, Ул.Салаўёва, М.Бярдзяева, Б. Хазанава і шмат якіх іншых даследчыкаў, можна прапанаваць наступныя рысы, уласцівыя рускаму інтэлігенту: 1) гатоўнасць служыць універсальнаму дабру; 2) ерэтычныя адносіны да існуючага парадку; 3) дэмакратызм; 4) стаічная адданасць выбранай ідэі; 5) ахвярнасць; 6) ідэалізацыя народа; 7) матэрыяльная неўладкаванасць і непрактычнасць у выніку пагардлівых адносін да знешняга дабрабыту дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі і зацікаўленасць бытавым матэрыялізмам значнай часткі сучаснай інтэлігенцыі; 8) касмапалітызм; 9) інтэлектуальная стаднасць значнай часткі перадрэвалюцыйнай інтэлігенцыі і духоўнае адзіноцтва паслярэвалюцыйнай; 10) атэізм пачатковага перыяду гістарычнага развіцця інтэлігента і некалькі ступеняў рэлігійнага адраджэння ў паслярэвалюцыйны час.

Характарыстыкі, якія мы прапануем, безумоўна, суб'ектыўныя і не прэтэндуюць на універсальнае вырашэнне ўсіх існуючых жыццёвых, філасофскіх, літаратурных і мастацкіх задач, што стаяць перад інтэлігенцыяй. Іншы раз толькі некалькі з гэтых рыс утвараюць закончаную

фігуру інтэлігента, у той час як механічнае пераапрананне прадмета ў даныя характарыстыкі можа прывесці да эфекту агароднага пудзіла.

У адной з прац, прысвечаных інтэлігенцыі, Цібар Жамуэлы некалькі механічна прыклаў рысы, уласцівыя радыкальнай частцы інтэлігенцыі тыпу М.Чарнышэўскага і В. Бялінскага да ўсяго рознакалібернага брацтва [13]. У выніку склалася ўражанне страты паўнацэннасці вобраза гэтай групы насельніцтва, якая неаднойчы ў гісторыі даказвала сваю здольнасць да мімікрыі і трансфармацыі.

У рускай літаратуры інтэлігенцыя часта была і з'яўляецца яе стваральнікам і героем. На Русі, як вядома, пісьменнік заўсёды займаў «лобнае» месца ў гістарычнай прасторы сваёй радзімы. Тут акцэнтуецца маральная адказнасць за тое, што адбываецца, адказнасць, выказаная ўпершыню фразай аднага з прабацькоў інтэлігенцыі – А. Радзішчавым: «Я паглядзеў вакол сябе – душа мая пакутамі чалавечымі ўражана стала» [14].

Пачынаючы з «Д'ябаліяды», творы М.Булгакава напісаны так, быццам яго «душа стала ўражанай пакутамі інтэлігенцыі». І безумоўна маюць рацыю тыя даследчыкі, каго не ашукала адна фраза ў «Майстры і Маргарыце» і хто азначыў гэты яго раман як апафеоз працы «пісьменніка, кроўна звязанага з інтэлігенцыяй».

Разнастайнасць тыпаў герояў-інтэлігентаў у рамане абумоўлена поліфанічнасцю розных светаў свядомасці. Сярод іх найбольш кантрастна вылучаюцца дзве катэгорыі інтэлігентаў. Назавём іх умоўна тыпамі са свядомасцю Берліёза і свядомасцю Майстра. Але нават у гэтых герояў-антыподаў знаходзіцца агульная рыса, якая выключае іх, на першы погляд, з інтэлігенцкага асяроддзя. Ахвярнасць, гатоўнасць аддаць сваё жыццё ў імя і для шчасця вышэйшай для інтэлігенцыі істоты – народа, на карысць якога яна працавала пакаленнямі, амаль непрыкметная ў характары Берліёза і Майстра. Нягледзячы на гэта фактычнае падабенства, матывы ў абодвух герояў – інтэлігентаў-антыподаў – значна адрозніваюцца. У першага, бюракрата ад савецкай літаратуры, пачуцці да народа адлюстраваны ва атрыманых у спадчыну ад разначынцаў адносінах да яго, якія вырадзіліся пасля рэвалюцыі ў звыклае клішэ: «Я ведаю, што народу патрэбна». У другога, літаратара ад Бога, гэта пачуццё знішчана самім «народушкам», сілаю тых, хто прэтэндуе на «веданне» народа, а тая невялікая здольнасць на ахвяру, што захавалася, прымяняльная толькі ў асабістых адносінах.

Мастацкае чуццё М.Булгакава адным з першых у сучаснай рускай літаратуры адлюстравала змены адносін да свету «новага» інтэлігента. Пісьменнік малюе тып, які М. Бярдзяеў азначыў як сярэдне-нармальную свядомасць: «Сярэдне-нармальная свядомасць ёсць свядомасць прыроднага чалавека, ёсць умацаванне прыроднага свету як адзіна рэальнага і ёсць адмаўленне духоўнага чалавека, духоўнага свету, духоўнага вопыту. Гэта ёсць мяшчанская назва гэтага свету, саманаціск і самаўпэўненне, якое адчувае сябе гаспадаром становішча ў гэтым свеце» [15]. Свядомасць інтэлігента тыпу Берліёза быццам ілюструе гэта азначэнне М.Бярдзяева. Чытач помніць шматслоўную прамову Берліёза, які «інструктаваў» небараку Івана наконт «правільных» адносінаў да ідэі Хрыста. Свядомасць тыпу Майстра адрозніваецца ад сярэдне-нармальнай свядомасці універсалізмам, скрыжаваннем мікракосму (духоўнага свету чалавека) і макракосму (свету Духа). Як відаць, менавіта гэты тып свабоднай творчай

асобы, якую мае на мэце сярэдне-нармальная свядомасць, і прывёў М. Булгакава, такога ж спадчыннага інтэлігента, як і яго героі, да крутога перавароту ў адносінах да кола людзей, ад якога ён усяляк адмяжоўваецца ў пачатку жыццёвага шляху. М. Чудакова ў сваім звароце да дакладчыкаў на Булгакаўскім сімпозіуме ў Натынгаме (1991 г.) адзначыла факт вяртання Булгакава да інтэлігенцыі як вырашальны ў яго творчай этыцы.

М. Бярдзяеў у памянёнай працы падзяляе прадстаўнікоў інтэлігенцыі на індывідуалістаў і творчых індывідуальнасцей. Трымаючыся яго тэрміналогіі, першыя лёгка атаясамліваюцца з інтэлігентам тыпу Берліёза, а другія – з тыпам Майстра. Прымаючы пад увагу універсальнасць душэўных і духоўных якасцей і паводзін герояў Іерусалімскіх глаў, яны не толькі лёгка асацыююцца, але і суадносяцца з героямі маскоўскіх. Індывідуалістам характэрна змяшчэнне ўласнай свядомасці ў скрынку прыдатных для моманту разважанняў. Яны выціскаюць, такім чынам, уласную творчую індывідуальнасць. Індывідуаліст, нават маючы здольнасць да творчасці або талент, не мае магчымасці вырвацца з сітуцыі падначаленасці ўмоўнасцям, што існуюць у свеце «сярэдне-нармальнай свядомасці». У той жа час абмежаванасць індывідуаліста адлюстроўваецца не толькі ў яго ідэйнай несвабодзе, але і ў імкненні падпарадкаваць навакольных пануючай ідэі.

Абодва індывідуалісты, Каіфа і Пілат, падпарадкаваны свету неабходнасці. Першасвятар шчыра верыць у тое, што яго ідэяй кіруе сам Бог: «Ведае народ іудзейскі, што ты ненавідзіш яго лютаю нянавісцю і многа мук ты яму прынясеш, але зусім ты яго не знішчыш! Абароніць яго бог» (ст.34). У «Майстры і Маргарыце» індывідуалісты ўражаны адсутнасцю самастойнасці, тым, што Майстар называе «сюрпрызам унутры» (ст.119). Воланд называе Левія Мацвея дурнем, але ў тэксце гэта хутчэй папрок у несамастойнасці, у абмежаванасці свабоды паслядоўніка Ісшуа. Гэтая несвабода – вынік знешне станоўчай па ступені маралі абмежавання чалавека і любой ушчамлённасці свабоды духу сярэдне-нармальнай свядомасцю.

Маргарыта ў Булгакава практычна адзіная мае поўную свабоду духу. Каханне для Маргарыты – гэта адзінае пачуццё, здольнае запоўніць цемру бяздушнасці, што настала ў свеце, які яе акружае. Усёй сілай сваёй жаночай інтуіцыі Маргарыта адчувае, што ў выбары каханага ёю кіравала ўсемагутная духоўная сіла, што містычна прызначала яе і Майстра адзін аднаму: «Гэта яна, урэшце, сцвярджала потым, што гэта не так, што кахалі мы адзін аднаго даўно, не ведаючы адно аднага, ніколі не бачачы» (ст.115).

Але не толькі сіла кахання, вырасшая з патрэбнасці вызваліцца ад цяжару сярэдне-нармальнай свядомасці, адрознівае Маргарыту ад носьбітаў індывідуалістычнага тыпу свядомасці. Яе творчая індывідуальнасць поўная выключнай міласэрнасцю, якая насычае прыродную патрэбнасць гэтай гераіні ў справядлівасці, праўдзе і свабодзе думкі. Міласэрнасць Маргарыты вартая ўвагі поўным альтруізмам, усведамленнем пераплеценасці, непарушнасці ўсяго, што адбываецца ў свеце з любым чалавечым лёсам. Алякуючыся над Фрыдай, Маргарыта рызыкавала стратай прыхільнасці Воланда – адзіным шанцам на сустрэчу з Майстрам. Але значна мацней за асабістае гора для яе аказалася выказванне спачування другой душы, страх страты надзеі, парушанае слова.

Воланд, першы герой рамана, які з самага пачатку твора сцвярджае ідэю Хрыста, вылучае міласэрнасць як асноватворчы душэўны фактар у

жыцці сучаснага чалавека «...ну, што ж... і міласэрнасць часам стукаецца ў сэрцы», - станоўча гаворыць ён пра масквічоў, як бы прабачаючы ім за гэта ўсе астатнія грахі.

Сіла індывідуальнасці Воланда ў творах М. Булгакава праяўляецца ў настойлівым сцвярджэнні гэтым героем вызвалення духу ад рабства ў свеце неабходнасці, прызнанне мікракосма і макракосма, сцвярджэнне недаўгавечнасці свядомасці індывідуалізму. Так, ён сцвярджае няслушнасць індывідуалізму ў маналогу, звернутым да Берліёза: «Міхаіл Аляксандравіч, – няголасна звярнуўся Воланд да галавы, і тады павекі забітага прыўзняліся, і на мёртвым твары Маргарыта, скалануўшыся, убачыла жывыя, поўныя думкі і пакуты вочы. – Усё адбылося, ці не праўда, – прадоўжыў Воланд, гледзячы ў вочы галавы, – галава адрэзана жанчынай, пасяджэнне не адбылося, і жыву я ў вашай кватэры. Гэта факт. А факт – самая ўпартая ў свеце рэч. Але цяпер нас цікавіць далейшае, а не гэты факт, які адбыўся. Вы заўсёды былі гарачым прапаведнікам той тэорыі, што пасля адразання галавы жыццё ў чалавеку спыняецца, ён ператвараецца ў попел і адыходзіць ў небыццё. Мне прыемна паведаміць вам, у прысутнасці маіх гасцей, хаця яны і з'яўляюцца доказам зусім іншай тэорыі, аб тым, што ваша тэорыя і сталая, і трапная. Зрэшты, усе тэорыі вартыя адна адной. Ёсць сярод іх і такая, у адпаведнасці з якой кожнаму будзе дадзена па яго веры. Хай жа спраўдзіцца ўсё гэта! Вы адыходзіце ў небыццё, а мне радасна будзе з чашы, у якую вы ператворыцеся, выпіць за быццё».

Значэнне інтуіцыі як якасна неабходнага элемента творчай індывідуальнасці ўвесь час адчуваецца ў «Майстры і Маргарыце». Інтуіцыя ў рамане іншы раз чытаецца як нешта раўнацэннае таленту. Нездарма майстар так узрадаваўся пацверджанню, што ён «угадаў» лёс свайго героя, а Маргарыта ў размове з Воландам падкрэслівае незвычайнасць каханнага яго творчай інтуіцыяй.

Нягледзячы на ўяўную мімалётнасць ролі Іешуа ў рамане, крэда яго міласэрнасці – «злых людзей няма ў свеце» (ст. 26) – арганізуе ўсю этычную канцэпцыю ў «Майстры і Маргарыце». Сам ён пяць разоў чыніць акты міласэрнасці: вызваляе Пілата ад пакутлівай болі, шкадуе Іуду, упрошвае ката даць вады таварышу па смяротнай кары і, урэшце, безагаворачна прабачае Пілата. Важна адзначыць, што гэты апошні, самы важны акт міласэрнасці фізічна здзяйсняецца Майстрам, творчай асобай і героем-антыподам Берліёза.

Здольнасцю да міласэрнасці адзначаецца яшчэ адзін эпізадычны герой рамана – прафесар Стравінскі. Імя Стравінскага таксама мімалётнае, як імя другога прафесара медыцыны Кузьміна. Несумяшчальнасць абодвух медыкаў адлюстроўваецца ва ўжо знаёмай апазіцыі – творчая індывідуальнасць – індывідуаліст, дзе Кузьмін – тыповы ў сваёй сярэдне-нармальнай свядомасці.

Акрамя творчай міласэрнасці, якой надзелены прафесар Стравінскі, ён таксама вызначаны тым, што з'яўляецца адзіным героем рамана, які непасрэдна названы там інтэлігентам. Іванушка, які да ўсеагульнай нечаканасці ператварыўся ў прафесара гісторыі Панырова, будучы яшчэ як бы ў падвешаным стане паміж некалькімі альтэрнатывамі – застацца дрэнным паэтам або стаць вучнем майстра, – спачатку ставіцца са звычайным апломбам недавучкі з народа да тыповага прадстаўніка інтэлігенцыі. Трансфармацыя яго характару ў канцы рамана безумоўная і

нечаканая. Рэакцыя Стравінскага, таксама, як і ў далейшым Майстра, на ранейшага «адукаванага» Івана адрозніваецца выключнай годнасцю, пачуццём, набытым новым інтэлігентам і неадкладна зафіксаваным Булгакавым. Пасля рэвалюцыі, калі ідэалізацыя народа як асноўная характарыстыка інтэлігенцыі рассеялася, прыйшло да канца яе векавое рабства і залежнасць ад яго. Найменшая частка рускай інтэлігенцыі, пра якую Булгакаў працягваў пісаць у эпоху, калі імя інтэлігент стала агульным, перажыўшы трагічнае крушэнне ідэалаў, не страціла сваёй духоўнасці ў новых умовах савецкага жыцця. Гэта духоўнасць, доўгі час амаль непрыкметная ў паўсядзённым жыцці і літаратурнай практыцы, усё ж такі падобна да Воландаўскай міласэрнасці, праявілася самым нечаканым чынам. Яна выявілася ў паводзінах А.Твардоўскага і А.Сахарава, у творах А. Ахматавай, М. Булгакава, М. Цвятаевай, Б. Пастэрнака. Пасля з'яўлення шасцідзесятнікаў духоўнасць інтэлігенцыі замацоўваецца зноў у рускай літаратуры. Ці трапляюцца ў гэтай літаратуры «разумныя» інтэлігенты, складае пытанне і невычарпальную тэму для даследчыкаў не толькі рускай культуры і літаратуры, але і большасці іншых славянскіх культур і літаратур, у тым ліку, бясспрэчна, і беларускай.

ЛІТАРАТУРА

1. ***Лесли Милн***. Михаил Булгаков. Критическая биография. Кембридж: Кембридж юниверсити пресс. 1990. С. 175, 261.
2. ***Элендия Проффер***. Булгаков. Энн Арбор: Ардис. 1984. С. 223, 595.
3. ***Ліст Булгакава савецкаму ўраду ад 28-га сакавіка 1930-га года быў упершыню надрукаваны ў часопісе «Грани»,*** 66 (1967). С.155-161. Сапраўднасць яго была пацверджана толькі ў 1987 г. публікацыямі ў СССР у часопісах «Октябрь». № 6. С. 176-180 і «Новый мир». № 8. С. 194-198.
4. ***Новый мир.*** № 8. С.194-198.
5. ***Мариэтта Чудакова***. Жизнеописание Михаила Булгакова. М.: Книга. 1988.
6. ***Булгаков М***. Избранное. М.: Худ. лит. 1980. С.76.
7. ***Ожегов С.И.*** Словарь русского языка. М.: Русский язык. 1975. С. 231.
8. ***Оксфордский толковый словарь.*** Оксфорд: Кларендон пресс. 1933. т. 1. С. 1022.
9. ***Новый словарь 20-го века.*** Нью-Йорк: Вебстер. 1979. С. 954.
10. ***Даль В.И.*** Толковый словарь живого великорусского языка. М.: Русский язык. 1979. С.46.
11. ***Btrlin I.*** Russian Thinkers, New York: Penguin Books, 1978, p.117.
12. ***Хазанов Б.*** Идущий по воде. Мюнхен: Страна и мир, 1985, с. 55.
13. ***Гимпилевич-Шварцман З.*** Интеллигент в романах «Доктор Живаго» и «Мастер и Маргарита». Оранж, США: Антиквариат, 1988.
14. ***Tibor Szamuely***. The Russian Tradition. London: Fontana Press, 1988.
15. ***Радищев А.Н.*** Путешествие из Петербурга в Москву. М., 1949, с. 39.
16. ***Бердяев Н.*** Философия свободного духа. Париж: ИМСА пресс, 1927, с. 40.

S U M M A R Y

The notions of «intelligent» and «intelligentsia» and their role in the novel by M.Bulgakov «Master and Margarita» are studied. The basic features characteristic of the Russian intelligent of the period before and past revolution are determined.